НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь,
твой народ
дачакаецца
Залацістага,
яснага дня!
М. Багдановіч.*

**№ 4 (116), САКАВІК 2011 ГОДА**

**http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна**

## ПОГЛЯД РЭДАКТАРА

# БЕЛАРУСЬ “ПРЫВЯЖУЦЬ” ДА “МІРНАГА АТАМА” РАСІЯН

15 сакавіка ў Менску прэм’еры Уладзімір Пуцін і Міхаіл Мясніковіч падпісалі пагадненне аб будаўніцтве АЭС на Беларусі. Гэта стала чарговым пунктам у працягу манапольнай залежнасці Беларусі ад расійскіх энерганосьбітаў.

Перадусім прынцыповая дамоўленасць аб узвядзенні беларускай атамнай электрастанцыі на Астравеччыне была дасягнута яшчэ ў пачатку 2009 года падчас расейска-беларускіх перамоваў. У лютым 2011 года праект накіравалі ў Мінэнерга Беларусі. Пры гэтым Менск падрыхтаваў запыт на мэтавы крэдыт у памеры 9 мільярдаў долараў . Насамрэч на будаўніцтва АЭС патрабуецца 6-7 мільярдаў. Важна тое, што атамная станцыя будзе будавацца па ўнутрырасейскіх цэнах. Разам з тым расейскі бок прадэманстраваў гатоўнасць выдзеліць крэдыт да 4 мільярдаў на вырашэнне праблем беларускай эканомікі. Беларусь павінна вяртаць у расейскі бюджэт мыта за нафтапрадукты, а грошай няма. Падобна на тое, што перспектыва будаўніцтва атамнай электрастанцыі па сваёй важкасці выйдзе на першы план. Разлічваецца на максімальнае паскарэнне гэтага праекта ў рамках цеснага ўзаемадзеяння дзвюх энергетычных сістэм. Плануецца ўвесці ў строй першы блок АЭС у 2017 годзе. Больш за тое, расейскі прэм’ер Уладзімір Пуцін абяцаў Беларусі беспрэцэдэнтны па бяспечнасці рэактар, які тым жа японцам нават і не сніўся. Між тым эколагі выказалі занепакоенасць у сувязі з планамі будаўніцтва АЭС на паўночным усходзе Беларусі. Ствараецца ўражанне, што кіраўнікі гэтак званай Саюзнай дзяржавы занадта спяшаюцца ажыццявіць загадзя распрацаваныя сумніўныя праекты. Пры гэтым яны не здолелі вынесці ўрок ні з чарнобыльскай трагедыі, ні з сумнага вопыту іншых краін. Па меншай меры недальнабачна не заўважаць, што ў Еўропе і ЗША пасля аварыі ў Чарнобылі доўга не будаваліся новыя АЭС, а некаторыя еўрапейскія краіны наогул вырашылі адмовіцца ад атамнай энергетыкі. Забілі трывогу і нашы эколагі, і вучоныя. Грамадскае аб’яднанне “Экадом”, аргкамітэт стварэння руху “Вучоныя за безъядзерную Беларусь” ды іншыя звярнуліся да ўраду Беларусі з адкрытай заявай, у якой заклікалі згарнуць планы па будаўніцтву атамнай станцыі ў краіне. Але як даўно вядома, урад на Беларусі нічога не вырашае. Па волі аднаго чалавека і вузкага кола яго прыхільнікаў, без шырокай дыскусіі ў грамадстве, ігнаруючы саветы вучоных, за спіной у народа ўзурпатары падпісваюць самыя нявыгадныя для краіны пагадненні.На жаль, яшчэ савецкая ўлада выгадавала народ у такім ключы, маўляў, як чыноўнікі вырашылі – так і будзе. І сапраўды, каму выгадна АЭС на Беларусі? І чаму яе будуць будаваць менавіта расейскія кампаніі, а не заходнія? Шэраг беларускіх і расейскіх незалежных экспертаў лічаць, што будаўніцтва АЭС у нашай эканамічна немэтазгоднае. Па-першае, праграма будаўніцтва зябярэ 9 мільярдаў долараў на 25 гадоў, і, хутчэй за ўсё нератвобрыцца ў даўгабуд. Па ўсяму выходзіць, што за вялікія грошы будуць разлічвацца будучыя пакаленні нашых дзяцей. Па-другое, у расейскай дзяржаўнай карпарацыі “Расатам” даволі высокі ўзровень карупцыі, у выніку чаго ядзерныя лабісты будуць шантажыраваць урад магчымасцю аварый і патрабаваць новых інвестыцый. І бадай, самае галоўнае: мы будзем прывязаны да ўранавага паліва усходняй суседкі, бо іхняя станцыя да гэтага прыстасаваная. Як лічыць дэмакратычны палітык і фізік Аляксандр Мілінкевіч, “мы ўсё болей губляем свой суверэнітэт – энергетычны, эканамічны, пад сур’ёзнай пагрозай палітычны.. Па сутнасці, Расея нам, як кажуць уцюхала сваю АЭС, скарыстаўшыся разрывам адносінаў з Захадам. Экалагічны аспект праекта яшчэ больш праблематычны. Трэба ўлічваць, што атамная электрастанцыя працуе не болей за 20-25 гадоў. Тым самым разбураецца міф аб невычарпальнасці ядзернай энергіі. Зрэшты, атамную станцыю, якая адслужыла свой век, нельга проста выключыць, як гэта можна зрабіць з цеплавой станцыяй. Пасля вываду з эксплуатацыі яна застаецца надзвычай небяспечным аб’ектам, які патрабуе сур’ёзнага абслугоўвання. А затраты пры гэтым такія ж, як і пры эксплуатацыі. Украіна, да прыкладу, не можа спыніць работу Чарнобыльскай АЭС толькі таму, што не мае неабходных 5-6 мільярдаў рублёў. Не трэба забываць і аб глабальных праблемах чалавецтва – у свеце ўжо накапілася звышт 200 тыс. тон ядзерных адыходаў. Акрамя адпрацаванага паліва, рэактар выкідае вялікую колькасць вадкіх і цвёрдых радыёактыўных адыходаў. Іх даводзіцца старанна захоўваць і затым абслугоўваць гэтыя сховішчы сотні гадоў. У тым жа Чарнобылі пасля аварыі было выраблена больш 400 сховішчаў. Агульнапрызнана, што ніводнае з іх не з’яўляецца надзейным. Па ўсяму відаць, атамныя станцыі на сённяшні момант вельмі выгадны тым, хто непасрэдна ўдзельнічае ў будаўніцтве і кантралюе фінансаванне. Дарэчы, у мінулым годзе на беларускім тэлебачанні ў вядомым токшоу “Выбар” тэлегледачам задалі пытанне, ці лічаць яны, што сучасныя атамныя станцыі з’яўляюцца бяспечнымі аб’ектамі? 87% апытаных адказалі адмоўна. Наўрад ці зараз па БТ пакажуць нешта падобнае. І яшчэ адзін важны фактар. Бясспрэчна, што АЭС патрэбен рэжыму Лукашэнкі як сродак палітычнага шантажу для ўтрымання ўлады неканстутыцыйным шляхам. Як казаў сам кіраўнік РБ, краіны, якія маюць АЭС, не бамбяць. Такім чынам ён падстрахаваўся ад інтэрвенцыі звонку. Аднак каб пры эксплуатацыі АЭС зноў не надарылася сітуацыя, падобная да чарнобыльскай. І тады замест абяцаных дабротаў цывілізацыі народ не прыпомніў прыказку: “Наш советский мирный атом вся Европа кроет матом!”

**Аляксандр Шчамлёў.**

## ЖЫВІ ЯК ГАСПАДАР

# ВЯРНУЦЬ ДАЎГІ ПРЫВАТНЫМ ГАСПАДАРКАМ

***Дзеля развіцця пачуцця гаспадара дзяржава абавязана вярнуць даўгі прыватным гаспадаркам. Падаецца, што ў адваротным выпадку на вёсцы мы не пачуем гукаў ні каровы, ні парася.***

Вядома, што эканамічная палітыка цяперашняй улады ў галіне сельскай гаспадаркі найперш была накіравана на ўмацаванне гаспадарак з дзяржаўнай формай уласнасці. А фермерскія і сялянскія гаспадаркі заўсёды заставаліся сам насам са сваімі праблемамі. За 16 гадоў кіравання краінай бюракратычны рэжым давёў асабістыя гаспадаркі да заняпаду. Ніякай канкрэтнай дапамогі ад дзяржавы сяляне так і не дачакаліся. Асаблівa вострa эканамічны крызіс адчулі на сабе прыватныя жывёлаводы. Як і ў большасці іншых раёнаў, у Шумілінскім пагалоўе асноўных відаў жывёлы, якую трымаюць сельскія жыхары, няўхільна скарачаецца. Так, 1 студзеня 2011 года колькасць буйной рагатай жывёлы на прыватных падворках складала 922 галавы, што склала 84,3 % да ўзроўню мінулага года. Кароў налічвалася 868 галоў (84,8%), коней – 235 галоў (81,3%). І гэта сумная тэндэнцыя пакуль не змяняецца. Прычыны відавочныя – вясковае насельніцтва старэе, а моладзь, калі і застаецца на вёсцы, не хоча трымаць скаціну. Але ці толькі таму пагалоўе жывёлы на прыватных сядзібах скарачаецца, а тыя гаспадары, якія трымаюць дзве і больш кароў становяцца героямі газетных публікацый? Адказ відавочны. Працэнт адмаўлення ад утрымання жывёлы на падворку павялічыўся менавіта з будаўніцтвам аграгарадкоў. За мінулыя тры гады на Шумiліншчыне ўзвялі 8 аграгарадкоў. У выніку на першае студзеня 2011года 66,7% гаспадарак насельніцтва не мелі ніякай жывёлы, буйную рагатую жывёлу трымае 85% вяскоўцаў, кароў 85,6%, свіней 80,5%, авечак 97,1%. Пасля таго, як вёскі сталі больш падобныя на паселішчы гарадскога тыпу, многія вяскоўцы страцілі цікавасць да пастаяннай працы на ўласных участках. Ды і гандлёвая сетка ў сельскай мясцовасці цяпер дастаткова развіта, у магазіны завозяць і малочныя, і мясныя прадукты. Акрамя таго, стала больш магчымасцей для баўлення вольнага часу, культурных мерапрыемстваў. Трэба думаць, працэс набліжэння да гарадского ладу жыцця поўнасцю натуральны. Чаму рабочы пасля працы на заводзе не працягвае стаяць у хатняга станка? Няўжо даярка пасля цяжкой працы на калгаснай ферме павінна яшчэ даглядаць і даіць сваю карову? Аднак, як бы там ні было, поўнасцю прыватны статак не знікне. У першую чаргу таму, што малочная карова – самая надзейная крыніца дадатковага заробку для вясковых жыхароў. Практычна кожны вясковы жыхар, хоча ён таго ці не, стаіць на зямлі, яе апрацоўвае, з яе жыве. У параўнанні з гараджанамі даходы вяскоўцаў, якія займаюцца сельскагаспадарчай вытворчасцю, вельмі нізкія.Таму менавіта на дзяржаве ляжыць асаблівая адказнасць за тое, каб вобразна кажучы, вярнуць вёсцы даўгі. Напрыклад, ствараючы ўсе неабходныя ўмовы для развіцця і падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак нашых грамадзян. Бо не сакрэт, што менавіта ўласныя падворкі прыносяць людзям тую частку даходаў, якую яны недаатрымліваюць, працуючы ў дзяржаўным сектары. Не трэба забываць, што даволі значная колькасць працаздольных у дзяржаўным сектары не працуе, нямала такіх, якія жывуць з уласнай гаспадаркі. Вось толькі замест рэальнай дапамогі ад дзяржавы прыватныя гаспадары, акрамя праграм на паперы і заклікаў у дзяржаным друку не атрымліваюць. Сёння, як ніколі раней, наспеў час для радыкальных рэформ. Чаму б не аддаць гэтыя два-тры гектары прысядзібнай зямлі ў прыватную ўласнасць гаспадарам без выкупу? Калі чалавек будзе ўпэўнены, што пакіне зямлю сваім нашчадкам, дык гэта будзе найлепшым стымулам для больш прадукцыйнай працы. Яшчэ можна паспрабаваць па прыкладу іншых райцэнтраў стварыць у Шуміліне “цэнтр падтрымкі і развіцця асабістых падсобных гаспадарак”. Цэнтр мог бы стаць своеасаблівым “адказам” на пастаянныя пытанні жыхароў: дзе купіць элітныя гатункі бульбы, чым падкарміць расліны, куды здаць ураджай і г. д. Так, цяперашні прыватнік пастаўлены ў няроўныя ўмовы з калгаснікамі. Калгасам даюць датацыі, льготныя крэдыты, авансы на зарплату, насенне, ГСМ, тэхніку ды яшчэ спісваюць даўгі. У той час, як прыватнік выжывае сам. Калі дзяржава пачне ў аднолькавай ступені справядліва ставіцца да ўсіх суб’ектаў гаспадарання?

## “СВІТАНАК” У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале *http://kamunikat.org/*, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: *http://kamunikat.org/svitanak.html*, што у каталагу “Пэрыёдыка” для далейшага выкарыстання яшчэ да з’яўлення газеты на паперы.**

## АБ’ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя «Світанка» змяшчае бясплатныя абвес-ткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатныхюрыстаў.Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

## ВЫРАШЫМ ПРАБЛЕМУ

# У ледзяным палоне

У цёплыя сакавіцкія дні можна ўбачыць, як на вуліцах каля дзяржаўных устаноў рупяцца купкі мужчын і жанчын з лапатамі і ламамі. Гэта рабочыя камунгаса і работнікі іншых арганізацый і прадпрыемстваў нашага раёна змагаюцца са снегам і лёдам на абочынах дарог і тратуарах. Так з надыходам вясны райвыканкам з дапамогай таннай рабочай сілы праводзіць ліквідацыю наступстваў зімняй стыхіі. Чаму па-ранейшаму да уборкі вуліц прыцягваюцца выпадковыя людзі, а не тыя, якія павінны гэтым займацца? У перыяды моцных снегападаў стала відавочна, што нашы шумілінскія камунальнікі ня здольныя працаваць ў аўральным рэжыме. Між тым, марозная і снежная зіма не з'яўляецца для работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі раёна нечым нечаканым і экстраардынарным. Сапраўды, за некалькі папярэдніх гадоў мы забыліся, што такое снежныя сумёты, галалёд і завеі, больш прывыклі да дажджоў, лужын і тумаnoў. А сёлета Шуміліна літаральна аказалася ў снежным палоне. Зразумела, тых адзінак і магутнасцей тэхнікі хапіла на галоўную задачу: толькі б праезную частку вызваліць ад сумётаў. Нягледзячы на тое, што механізатары УП ЖКГ яшчэ ў лютым пачалі вывозіць снег з абочын дарог і тратуараў, снежная навала не паменела. І нават цяперашняя веснавая адліга асабліва не змяніла сітуацыю, а, наадварот, дадала яшчэ і галалёдзіцу. Справа ў тым, што снег рассоўваўся ў бакі дарогі, дзе потым яго моцна прыхапіў мароз. У выніку паабапал вуліц утварыліся цэлыя гурбы, якія звузілі праезджую частку на цэлы метр. А па многіх тратуарах было складана хадзіць з-за галалёду. Шмат дзе лёд са снегам ляжаў тоўстымі пластамі, каля якіх пешаходы вытапталі тонкую сцяжынку. Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што не ўсе арганізацыі сядзелі склаўшы рукі. Людзям не замянілі абледзянелыя прыступкі ганкаў наведваць школы, магазіны, банкі. А вось чысценькую тратуарную плітку можна было ўбачыць хіба толькі на падыходзе да Шумілінскага райвыканкама. Здавалася б, навошта змагацца са льдом і снегам, калі пацяплее, ён сам і растане? Але ж ёсць такое паняцце, як падведамасныя тэрыторыі. А гэта ж тэрыторыі, за парадак на якіх адказваюць пэўныя службовыя асобы – кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый і устаноў. Па неафіцыйнай інфармацыі, Шуміліна наведаў нейкі абласны начальнік, якому не спадабалася абледзянелая тратуарная плітка. Паступіў загад райвыканкаму, тыя ў сваю чаргу выстраілі падначаленых, і адразу пачалася штурмаўшчына. На вуліцах райцэнтра з'явіліся рабочыя, якія штодзень ламамі дзяўблі лёд каля дзяржаўных устаноў. У прыватных гутарках рабочыя заўважылі, што збіваць ламом лёд з тратуарнай пліткі было б не зусім правільна – яе можна пашкодзіць. Увогуле, трэба было задзейнічаць людзей раней, а плітку ад снегу ачышчаць пастаянна, а не тады, калі на ёй ужо утварыліся ледзяныя нагрувашчванні. Ды і жанчыны з ламамі супраць лёду – гэты мінулы век, перажыткі савецкіх часоў. Усё ж такі мы жывем у 21 стагоддзі, а снегаўборачнай тэхнікі чамусьці не хапае. Што ўжо казаць пра Шуміліна, калі ў Віцебску падчас снегападаў працавала па 20-30 снегаўборачных машын. Але і гэта тэхніка зношана на 90%, а гарадскі парк снегаўборачных машын не абнаўляўся ўжо чатыры гады, і кожная трэцяя машына сыходзіць з лініі з-за паломак. Таму і даводзіцца змагацца з катаклізмамі ўсім разам. А можа, пачакаем вясны?

> **Раней не хапала снегаўборачнай тэхнікі, а зараз дзяўбуць ламамі.**

**Алесь Прыбярэжны.**

## ЖЫВІ ЯК ГАСПАДАР

# НЕЗАПАТРАБАВАНЫЯ ДАМЫ



Калі няма ўласніка жыля, то жылы фонд прыходзіць у заняпад. Гэта спаўна адчуваецца, як у вёсках, так і ў аграгарадках.

Згодна Указу кіраўніка дзяржавы па адраджэнню сяла, асноўная ўвага раённых уладаў у 2005-2010 гадах была накіравана на выкананне праграмы па фарміраванню новых аграгарадкоў. На Шумілінршчыне таксама кіпела работа па будаўніцтву новых жыллёвых аб'ектаў на вёсцы: была праведзена рэканструкцыя васьмі старых калгасных сядзібаў. Аднак ці ўдзялялася пэўная ўвага своечасоваму і якаснаму пераўтварэнню населеных пунктаў у аграгарадкі з мэтай устойлівага развіцця сельскіх тэрыторый? Што ўдалося зрабіць для матывацыі пражывання моладзі ў сельскай мясцовасці і ці эфектыўна выкарыстоўваліся дзяржаўныя сродкі, выдзеленыя на добраўпарадкаванне вёсак? Як паказала практыка, у нашым раёне ў асноўным праводзілася толькі рэканструкцыя старой сацыяльнай сферы. Прычым, мадэрнізацыю старога жылога фонда, пабудаванага ў 70-я гады амаль праводзілі. Не кажучы ўжо пра зношаныя інжынерныя сеткі і камунікацыі. Кіраўніцтва УП ЖКГ не знайшло фінансы на неабходныя віды работ. З-за недахопу грошай замест капітальнага рамонту абмяжаваліся касметычнымі работамі на фасадах дамоў былых калгасных цэнтраў. Затое ўсе сродкі ўклалі ў будаўніцтва новых жылых дамоў прысядзібнага тыпу. Праўда і тое, што ад многіх навасёлаў пасыпаліся скаргі на ўмовы пражывання ў новазбудаваных доміках. Як заўжды, не абыйшлося без агрэхаў і недаробкаў, а каштуюць яны нятанна. Некаторыя домікі аказаліся не вельмі зручныя для пражывання. У асноўным у новае жыллё перасяліліся калгаснікі, якія пражывалі ў старых шматпавярхоўках. Як затым высветлілася, моладзь на вёску гэтымі "асабнякамі" не заманілі, яе пужае галеча ўсёй інфраструктуры занядбанага сяла. Тым больш, што заробкі ў ляжачых калгасах нашага раёна невялікія. Пасля таго, як людзі пакінулі старыя шматпавярхоўкі, гэтыя будынкі хутка ператварыліся ў руіны. Да прыкладу, у аграгарадку Амбросавічы апусцеў цэлы двухпавярховы дом. Пры усім тым, што жылы дом яшчэ знаходзіўся ў даволі спраўным стане. Сюды нават прыязджала кіраўніцтва райбыткамбіната, планавалі, як лепш выкарыстаць будынак для арганізацыі. Але ў апошні момант па нейкім прычынам адмовіліся. У пустуючым доме забілі дзверы, а вокны зацягнулі поліэтыленам да лепшых часоў. Аднак мясцовыя жыхары кансервацыю аб'екта зразумелі па-свойму: па начам вынеслі сантэхніку, знялі дзверы, выставілі рамы і павыдзіралі дошкі. Карацей кажучы, ад жылога дома засталіся адны сцены. Між іншым, у раёне ідзе знос струхлелых пабудоў, якія пакінулі прыватныя гаспадары, у асобных выпадках улады абыходзяцца і без дазволу ўласніка. А руіны былых шматпавярховак па-ранейшаму стаяць за дэкаратыўнай агароджай і псуюць сваім выглядам новыя аграгарадкі. Прыбіраць свае "шэдэўры" савецкай архітэктуры ўлады не спяшаюцца. Верагодна, што падобная перспектыва чакае і новыя домікі. У тых жа Амбросавічах тры маладыя сям'і, пражыўшы пару гадоў у аграгарадку, з'ехалі ў Шуміліна. Усё больш незаселеных дамоў без маладых гаспадароў прыходзяць у заняпад, а старым пераязджаць у гэтыя "харомы" няма ніякага сэнсу. Атрымліваецца замкнёнае кола: з аднаго боку, прымушаюць будаваць гэтыя домікі, а з другога, яны застаюцца незапатрабаванымі. Такім чынам улады чарговы раз наступілі на адны і тыя ж граблі, калі пасняшаліся з рэалізацыяй гэтак званай праграмы адраджэння сяла. Зразумела, што такія праекты трэба вырашаць з удзелам усяго грамадства, а не па дырэктывах амбіцыёзнага кіраўніка дзяржавы.

**Я. Вайтовіч.**

***На фота:*** пабітыя вокны дома ў аграгарадку.

## У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# ЗАЎЧАСНАЯ СМЕРЦЬ СКАРАЧАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА РАЁНА

Насельніцтва Шумілінршчыны скарачаецца не столькі ў выніку смерці па старасці, колькі ў выніку заўчаснай смерці. Пачатак гэтага года прынёс новыя таму сведчанні.

У сучаснай дзяржаве Рэспубліка Беларусь дэмаграфічная сітуацыя прымушае жадаць лепшага. За апошніх дзесяць гадоў насельніцтва Беларусі скарацілася на 541 тысячу чалавек. Чаму змяншаецца насельніцтва літаральна ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны? Не адзін раз раз спрабавалі знайсці адказы на гэта няпростае пытанне кіраўнікі ўсіх узроўняў улады. Актыўнасць нашых чыноўнікаў у галіне павышэння дэмаграфічнай сітуацыі была скіравана найбольш у сацыяльную сферу. Выкарыстоўваліся метады па стымуляванню нараджальнасці шляхам фінансавай дапамогі шматдзетным сем'ям, ствaралася спрыяльнае асяроддзе для ахвотных завесці дзіця. Дзяржава рабіла акцэнт на ўтрыманне жанчын дома ільготамі і сацыяльнымі дапамогамі. Апроч таго, распрацоўваліся праекты па гендэрным раўнапраўі. Беларусь – адна з нешматлікіх краінаў, дзе мужчыны могуць сыходзіць у дэкрэтны адпачынак па доглядзе за дзіцём. Неаднаразова выказваўся па дэмаграфічнаму пытанню і кіраўнік РБ Аляксандр Лукашэнка, які назваў дэмаграфічную сітуацыю "самай вялікай і балючай праблемай". На яго думку, на Беларусі павінна жыць, як мінімум 30 мільёнаў чалавек, а не 10. Пакуль што не далі станоўчых вынікаў мерапрыемствы па выкананню праграмы дэмаграфічнай бяспекі і ў нашым раёне. Згодна афіцыйным дадзеным перапісу 2009 года ў раёне пражывала 20716 чалавек. Да гэтага пры папярэднім перапісу налічвалася 23,2 тысячы жыхароў. Статыстыка сведчыць аб тым, што на Шумілінршчыне, як і па краіне ў цэлым, назіраецца натуральная страта насельніцтва. Характэрная рыса цяперашняй дэмаграфічнай сітуацыі – нізкая нараджальнасць і высокі ўзровень смяротнасці. Змяненне гэтых паказчыкаў прыводзіць да змянення колькасці насельніцтва. У бягучым годзе толькі ў студзені ў нашым раёне памерла 44 чалавекі, у тым ліку 11 – працаздольнага ўзросту. У Шуміліне і Обалі пайшлі з жыцця 13 чалавек, у вёсках – 31. Большасць насельніцтва памірае ва ўзросце, старэйшым за працаздольны, што абумоўлена старэннем насельніцтва. Сярод прычын смяротнасці на першым месцы стаяць хваробы сістэмы кровазвароту – палавіна усіх выпадкаў. Па гэтай прычыне ў студзені памёр 21 чалавек. У ліку фактараў, якія павялічваюць смяротнасць, – пажары, дарожна-тарнспартныя здарэнні і атручванне няякасным алкаголем. Да прыкладу, у мінулым годзе зарэгістравана 19 смяротных выпадкаў атручвання алкагольнымі сурагатамі, а чатыры чалавекі згарэлі ў на пажарах стане алкагольнага ап'янення. У студзені гэтага года на дарогах ужо загінулі два чалавекі, тры атрымалі траўмы. На сніжэнне нараджальнасці аказваюць уплыў негатыўныя тэндэнцыі ў сямейна-шлюбных адносінах. У нашым раёне ў студзені зарэгістравана 6 шлюбаў, нарадзілася 18 хлопчыкаў і 6 дзяўчынак. Разводаў не было, аднак васьмі сем'ям без дзяцей і адзінаццаці з дзецьмі судом быў дадзены тэрмін на прымірэнне. Аналіз дэмаграфічнай сітуацыі ў Шумілінскім раёне паказвае, што пераважная большасць людзей не дажывае да старасці, а заўчасна памірае ад цяжкіх хвароб. Ад старасці ў раёне памерла ўсяго чатыры чалавекі. А гэта азначае, што па-ранейшаму для жыхароў нашага раёна не створаны элементарныя камфортныя побытавыя ўмовы пражывання. Як правіла, нізкая якасць жыцця, недахоп бюджэтных сродкаў для аховы здароўя прыводзіць да масавых захворванняў, якія ўсё часцей будуць заканчвацца заўчаснай смерцю нашых суайчыннікаў.

**Алесь Шумскі.**

# ДАРАЖЭЮЦЬ ПРАДУКТЫ ХАРЧАВАННЯ

У нашым раёне, як і па ўсёй Беларусі працягваюць даражэць прадукты харчавання. Менавіта пасля выбараў імкліва падскочылі ўверх цэны на ўсе тавары і паслугі. Улады абвясцілі, што на 2-3 працэнты падвышаюцца гранічныя адпускныя цэны на прадукты харчавання: свініну, ялавічыну, малако, кефір і тварог. Ніжэй прыведзены параўнальныя кошты на прадукты харчавання ў крамах Шумілінскага райспажыўтаварыства.

| Наименование продуктов | декабрь | март |
|---|---|---|
| Хлеб чёрный | 1550 | 2070 |
| Батон | 1810 | 1980 |
| Молоко 3,5, 1 л | 1860 | 1960 |
| Сахар, 1 кг | 2980 | 3600 |
| Масло подсолнечное "Золотое семечко" | 5500 | 6890 |
| Колбаса вареная "Докторская", 1 кг | 13580 | 14250 |
| Макароны, 1 кг | 2560 | 2840 |
| Масло сливочное , "Крестьянское" 200 гр. | 3730 | 4570 |
| Крупа рисовая, 1 кг | 4290 | 4390 |
| Крупа гречневая, 1 кг | 5450 | 15230 |

## КНІГА СКАРГАЎ

# РЭХА НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

**Грэчка з'явілася, а бутэлькі здаць магчыма, толькі раз у тыдзень.**

Пытанні забяспячэння насельніцтва пастаянна асвятляюцца ў матэрыялах нашых карэспандэнтаў. Пад асаблівай увагай рэдакцыі крытычныя звароты грамадзян, якія паступаюць ў рэдакцыю. Вусныя звароты чытачоў таксама служаць падставай для падрыхтоўкі праблемных матэрыялаў, на якія атрымаць адзначны адказ часам немагчыма. Аднак праз газету можна зрабіць пытанне больш актуальным у грамадстве, звярнуцца да адказных асоб за кампетэнтным тлумачэннем. У мінулым нумары 3 (115) Сьвітанка быў змешчаны артыкул "Пажаданні пакупнікоў", у якім былі скаргі пакупнікоў з вёскі Пісарава, Амбросавічы і пасёлка Прыазёрны на работу сельскіх крамаў. У прыватнасці, у продажы адсутнічалі некаторыя прадукты: маргарын, тлушч, алей. Амаль ва ўсіх магазінах раёна цэлы месяц немагчыма было набыць грэчку. Адзін з кіраўнікоў Шумілінскага райспажыўтаварыства сітуацыю падрабязна так і не патлумачыў, аднак запэўніў, што ў бліжэйшы час неабходныя тавары будуць завезены. І сапраўды, праз тыдзень недахопы ў рабоце гандлю былі выпраўлены. Тавары з'явіліся на паліцах крамаў. Зараз ажыятажу вакол дэфіцыту грэчкі няма. На базу завезлі расейскія крупы, якія расфасавалі ў магазінах. Але кілаграм імпартнай грэчкі каштуе больш за 16 тысяч рублёў. Попыт на грэчку ў раёне не зменшыўся, аднак і кошты на гэтым не спыняцца. У Расеі і на Украіне летась быў неўраджай на яе. Таму ня выключана, што неўзабаве за расейскія крупы давядзецца выкладваць больш за 19 тысячаў рублёў. А пустыя бутэлькі прыйдзецца здаваць адзін раз у тыдзень у вызначаныя дні – не хапае тары.

**С. Горкі.**

## ГАЛОЎНАЯ ПАДЗЕЯ

# День Воли: Колас сидит, Купала взят под стражу

ВОЗЛОЖИТЬ ЦВЕТЫ К ПАМЯТНИКАМ НАРОДНЫМ ПОЭТАМ В ДЕНЬ ВОЛИ МНОГИЕ БЕЛОРУССКИЕ ДЕМОКРАТЫ ТАК И НЕ СМОГЛИ. ВЕЧЕРОМ 25 МАРТА НА ПОДСТУПАХ К СТОЛИЧНОЙ ПЛОЩАДИ ЯКУБА КОЛАСА (И ЕЩЕ РАНЬШЕ, С УТРА, ПОВСЮДУ) АКТИВИСТОВ «ВИНТИЛИ» ПРЕВЕНТИВНО, А СКВЕР ЯНКИ КУПАЛЫ ПРОСТО ОЦЕПИЛИ ПО ПЕРИМЕТРУ.

Одна из женщин напрасно просила милиционеров пропустить к «арестованному», как она выразилась, Купале. Блюстители придумали гениальный ход: в сквере, мол, обнаружен подозрительный ящик с проводами. В итоге монумент Купалы «взяли под стражу», ну а бронзовый Колас и так сидит, мрачно шутили в этот вечер журналисты.

**Чтобы никто не поднимал голову**

То, что 19 декабря, перед диким разгромом Площади, властные стратеги нашпиговали спецназом Дом правительства, в общем-то, понятно: все-таки административное здание, стратегический объект. Ну а здесь? Это же памятники! Какую угрозу власти несет возложение цветов?

Тем не менее, еще накануне в регионах милиция обходила оппозиционеров и предупреждала, чтобы в Минск не совались. Потом начались массовые задержания. В том числе и журналистов.

«Это общая логика репрессий после 19 декабря, — так прокомментировал для Naviny.by действия властей накануне и в День воли эксперт аналитического центра «Стратегия» **Валерий Карбалевич.** — Цель — окончательно задушить попытки сопротивления, запугать, посеять страх. Чтобы никто не поднимал голову».

Подобный взгляд и у политического обозревателя **Павлюка Быковского.** «Если события 19 декабря использовались властями для закручивания гаек, то действия 25 марта укладываются в ту же логику. Похоже, правящий режим не намерен допускать сомнений в том, что будет держать ситуацию под контролем», — отметил эксперт в интервью для Naviny.by.

**За что боролись, на то и напоролись**

То, что организаторы Дня воли решили не подставлять публику под дубинки, дали отбой запрещенному шествию, — решение, в принципе, здравое. Политзаключенных и так полна коробушка.

Но итоговый формат — цветы, сквер Янки Купалы — оказался вынужденным, скомканным. Вход в огороженный сквер блокируется элементарно, как Фермопильский проход. В итоге те, кто собрался на сакральный неформальный праздник, ушли несолоно хлебавши.

Как выразился заместитель председателя движения "За Свободу" **Виктор Корнеенко,** «цветочный формат Дня воли стал результатом игр в радикализм».

Действительно, ведь предлагалось же здравыми головами заявить площадку у Академии наук, где власть не раз дозволяла митинги. Но потом с подачи других, горячих голов выскочила площадь Якуба Коласа, которая явно не «прокатывала» в горисполкоме. Власти в ответ «послали на Бангалор» — неудобное место, символ позора и соглашательства в категориях оппозиционной морали.

К слову, зампред Объединенной гражданской партии **Лев Марголин,** оставшийся на хозяйстве после упаковки Анатолия Лебедько в тюрьму КГБ, ударился в ересь и осторожно предложил на перспективу пересмотреть отношение к заклейменной площади Бангалор.

Заклеймили и его. Хотя, вновь-таки, если здраво рассудить, может, лучше, чем несколько сотен на несанкционированной акции, собрать десять тысяч человек на разрешенном мероприятии? Народ немного раскрепостится, в следующий раз придет больше…

Наконец, любой формат выглядел бы гораздо достойнее, солиднее, принимайся он консолидированно. А так ведь вновь — кто в лес, а кто по дрова.

«Неразумно путать своих сторонников разными сценариями празднования одного и того же Дня воли, — полагает Павлюк Быковский. — Сейчас была большая разбежка даже по местам сбора».

Правда, добавляет аналитик, в итоге почти весь город оказался оцеплен, что вызвало недовольство и у многих не ангажированных в политику людей. «Но я сомневаюсь, что именно такие цели ставили оппозиционные политики, и вряд ли они могут извлечь прямую пользу из произошедшего», — резюмировал собеседник Naviny.by.

**Александр КЛАСКОВСКИЙ.**

# ВЕЛИКОБРИТАНИЯ СЧИТАЕТ ДАШКЕВИЧА И ЛОБОВА ПОЛИТИЧЕСКИМИ ЗАКЛЮЧЕННЫМИ

ПРАВИТЕЛЬСТВО ВЕЛИКОБРИТАНИИ СЕРЬЕЗНО ОБЕСПОКОЕНО ПРИГОВОРАМИ, ВЫНЕСЕННЫМИ БЕЛОРУССКИМ МОЛОДЕЖНЫМ АКТИВИСТАМ ДМИТРИЮ ДАШКЕВИЧУ И ЭДУАРДУ ЛОБОВУ. С ТАКИМ ЗАЯВЛЕНИЕМ ВЫСТУПИЛ 25 МАРТА МИНИСТР ПО ДЕЛАМ ЕВРОПЫ ДЭВИД ЛИДИНГТОН, СООБЩИЛИ БЕЛАПАН В БРИТАНСКОМ ПОСОЛЬСТВЕ.

«Я серьезно обеспокоен сообщением о том, что Дмитрий Дашкевич, лидер белорусской молодежной организации «Молодой фронт», и Эдуард Лобов, еще один член «Молодого фронта», были приговорены белорусским судом к двум и четырем годам тюремного заключения соответственно за «злостное хулиганство», — сказал Лидингтон.

Как отметил британский министр, обстоятельства их ареста, произошедшего накануне президентских выборов 19 декабря, «крайне подозрительны». «На самом судебном процессе свидетели обвинения представили чрезвычайно противоречивые показания, а обвиняемые не получили возможности воочию увидеть своих обвинителей», — отмечает Дэвид Лидингтон.

Он также обращает внимание на то, что адвокат, первоначально согласившийся защищать Дашкевича, был «исключен из состава Минской городской коллегии адвокатов под давлением Министерства юстиции». По словам британского министра, такое отношение к Дашкевичу и Лобову «наносит еще больший ущерб и без того запятнанной репутации белорусской судебной системы».

«Я хочу абсолютно четко разъяснить, что правительство Великобритании считает Дашкевича и Лобова политическими заключенными, пополнившими длинный и продолжающий расти список таких заключенных в Беларуси», — сказал Лидингтон. По его словам, Великобритания призывает белорусские власти «положить конец этому постыдному положению дел, освободить всех политических заключенных и снять все обвинения против тех, кто ожидает суда в связи с событиями, имеющими отношение к протестам 19 декабря 2010 года».

24 марта лидер международного общественного объединения «Молодой фронт» (Чехия) 29-летний Дмитрий Дашкевич был приговорен к двум годам лишения свободы в колонии общего режима, активист этой организации 22-летний Эдуард Лобов — к четырем годам в колонии усиленного режима. Они признаны виновными по части 3 статьи 339 Уголовного кодекса (особо злостное хулиганство).

Молодофронтовцы были задержаны в Минске 18 декабря 2010 года. По информации ГУВД Мингорисполкома, во дворе жилого дома по улице Янки Брыля они якобы избивали Константина Савицкого и Олега Малышева. Задержание Дашкевича и Лобова представители оппозиции и правозащитники расценили как превентивную меру милиции накануне выборов президента.

Молодежные активисты виновными себя не признали. Выступая в суде с последним словом, Дашкевич выразил уверенность, что все, кто лжесвидетельствовал против него, и те "якобы потерпевшие", которые давали показания в суде из соседней комнаты (по официальной версии, суд поместил их туда из соображений безопасности), в будущем обязательно понесут справедливое наказание.

**Татьяна Коровенкова, «БелаПАН».**

## ДЭМАКРАТЫЧНЫ РУХ

# КОНСОЛИДАЦИЯ ОППОЗИЦИИ ДОЛЖНА БЫТЬ НА ДЕЙСТВИЯХ, А НЕ НА СЛОВАХ

**Консолидация оппозиционных сил должна быть на действиях, а не на словах, заявил лидер движения "За Свободу" Александр Милинкевич 18 марта на пресс-конференции в Минске.**

По его словам, о консолидации в оппозиционной среде говорят много. «Что-то в этом плане было сделано. Можно назвать положительные примеры сотрудничества, например, на парламентских выборах. Но есть и большие неудачи», - сказал он.

Милинкевич считает, что в результате президентских выборов проиграли все: власть, оппозиция, народ. «Мы отброшены на несколько лет назад в своем развитии. Под угрозой находится существование демократии, независимости страны», - сказал он.

«Консолидация оппозиционных сил и гражданского общества должна стать не словом, а действием. Должны консолидироваться те, кто понимает, что происходит в стране, ее перспективы, а также готов нести ответственность», - подчеркнул Милинкевич.

Как ранее сообщал БелаПАН, ряд общественных структур инициируют процесс консолидации гражданского общества и демократической оппозиции на основе единой стратегии действий. В частности, политической оппозиции была представлена «Стратегия-2012: От диалога внутри демократических сил к диалогу с режимом».

Лидер движения «За Свободу» считает важным, что гражданское общество предлагает создать консолидирующий центр на одной стратегии. «Мы должны иметь план действий. Если не выработаем стратегию, то никогда не станем реальным субъектом политики», - сказал Милинкевич.

«Некоторые говорят: люди в тюрьме, а вы про какие-то стратегии. Да, тема политзаключенных на первом месте. Но если нет стратегии, то это пустое место, а не демократическое сообщество. Призываю демократические силы отойти от амбиций, объединиться, стать силой в обществе», - заявил Милинкевич.

## СВЕТ ПРА БЕЛАРУСЬ

# СЕНАТ ЗША ПРЫНЯЎ ЖОРСТКУЮ РЭЗАЛЮЦЫЮ ПА БЕЛАРУСІ

**Сенат ЗША адзінагалосна прыняў рэзалюцыю, якая асуджае прэзідэнцкія выбары ў Беларусі ў снежні 2010 году як нелегітымныя і ашуканскія ды заклікае беларускія ўлады да вызвалення ўсіх палітычных вязняў.**

Рэзалюцыя заклікае прэзідэнта ЗША і дзяржсакратара ЗША каардынаваць палітыку ЗША адносна Беларусі з палітыкай Еўразвязу; узнавіць тэхнічную і матэрыяльную падтрымку апазіцыі і грамадзянскай супольнасці ў Беларусі; пашырыць амерыканскі спіс службовых асобаў Беларусі, адказных за перaслед апанентаў рэжыму пасьля 19 снежня 2010, і накласці мэтанакіраваныя санкцыі на гэтых асобаў ды іх сямейнікаў; вызначыць далейшых прадпрыемствы, якія ўзбагачаюць рэжым Аляксандра Лукашэнкі, ды забараніць гандаль з імі і замарозіць іх актывы.

Рэзалюцыя заклікае Еўразвяз далучыцца да амерыканскіх санкцыяў супраць «Белнафтахіму» («Лакафарбы» і «Шкловалакна»);

спыніць усе праекты ў адносінах да беларускіх уладаў, адказных за падаўленне апазіцыі і парушэнні правоў чалавека, ды выключыць беларускіх службовых асобаў з удзелу ў сустрэчах Усходняга партнёрства; пашырыць еўрапейскі спіс службовых асобаў Беларусі, адказных за перaслед апанентаў рэжыму пасля 19 снежня 2010, і накласці мэтанакіраваныя санкцыі на гэтых асобаў ды іх сямейнікаў.

Рэзалюцыя таксама заклікае Міжнародную хакейную федэрацыю забраць у Беларусі права на арганізацыю чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе, калі беларуская ўлады ня вызваляць усіх палітзняволеных.

Рэзалюцыя была ўнесеная на разгляд Сенату ЗША 9 сакавіка сенатарамі Дыкам Дэрбінам, Джозефам Ліберманам, Джонам Маккейнам, Бенджамінам Кардынам.

Прадстаўляючы рэзалюцыю ў Сенаце, сенатар Джозеф Ліберман сказаў, сярод іншага, што рэзалюцыя «скажа дысідэнтам у Беларусі, што мы не забылі і не забудзем ні пра іх, ні пра іхную справу, што мы памятаем іх імёны і будзем салідарна стаяць побач з імі, пакуль яны не дасягнуць сваёй мэты — свабоднай і дэмакратычнай Беларусі.»

**«Радыё Свабода».**

# 25 САКАВІКА

*Дваццаць пятага сакавіка -*
*Годны дзень*
*Беларускай Дзяржавы.*
*Веснаплынных вятроў талака*
*Пыл з кароны атрэсла іржавы.*

*Шматавалі нас досыць арлы*
*І з адной, і зь дзьвюма галавамі*
*Мы ня зь нейкай бязроднай імглы,*
*Нас вякі як сваіх гадавалі.*

*Мы - ратаі сьвятла, Крывічы,*
*Верхачы неўміручай Пагоні.*
*Маладзік сакалом на плячы,*
*Гартны меч у цьвёрдай далоні.*

*Лятуць нашыя мары рака*
*Бел-чырвона-белага сьцяга.*
*Дваццаць пятага сакавіка -*
*Наша сьвята, Пароль і Прысяга!*

**Рыгор Барадулін.**

## ПРАБЛЕМЫ ЭКАНОМІКІ

# Ці будзем раўняцца на расійскія цэны

ТЭМА ЦЭН НА ПРАДУКТЫ І ПАСЛУГІ, НАПЭЎНА, САМАЯ ПАПУЛЯРНАЯ СЯРОД АБСАЛЮТНАЙ БОЛЬШАСЦІ НАШЫХ СУАЙЧЫННІКАЎ І, ПЕРАКАНАНЫ, ЗАСТАНЕЦЦА ТАКОЙ ЯШЧЭ ВЕЛЬМІ ПРАЦЯГЛЫ ЧАС, КАЛІ НЕ ЎВЕСЬ 2011 ГОД.

Сёлета, паводле Асноўных кірункаў грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2011 год, рост цэн не павінен перасягнуць мяжу ў 7,5—8,5%, аднак толькі за студзень гэтага года цэны павысіліся на 4,2% (!) у параўнанні са снежнем мінулага года. Так што заяўленыя 7,5—8,5 гадавых працэнтаў мы павінны атрымаць у самай недалёкай будучыні.

Паведамленні аб чарговым павышэнні цэн нагадваюць франтавыя зводкі.

**Транспарт**

Кошт праезду ў сталіцы ў тралейбусе, аўтобусе, трамвае, метро павышаецца на 20 працэнтаў — да 850 рублёў. Няма ніякіх сумневаў, што такія «транспартныя» павышэнні трэба чакаць і у іншых беларускіх гарадах.

**Хлеб**

Міністэрства эканомікі дазволіла павышэнне ў сакавіку і красавіку адпускных коштаў на хлеб і няздобныя булачныя вырабы па 1,7—5% у месяц. Адпаведна да 1 мая хлеб можа падаражэць на 10 працэнтаў.

**Ялавічына, свініна і малако**

Тое ж Мінэканомікі паведаміла, што ў сакавіку павышаюцца гранічныя адпускныя цэны на ялавічыну патушную да 4%, свініну патушную, малако, кефір, смятану, тварог — да 2%, у красавіку — на малако, кефір, смятану, тварог і ялавічыну патушную да 2%.

Праўда, многія пакупнікі цвёрда перакананы, што гэтыя вельмі важныя для страўніка беларуса прадукты ўжо істотна падаражэлі напрыканцы мінулага года.

У ЗША ў цэлым прадукты харчавання ў лютым падаражэлі на 3,9% — гэта максімальныя тэмпы росту з пачатку 70-х гадоў мінулага сіагоддзя.

**Бензін і дызельнае паліва**

Канцэрн «Белнафтахім» афіцыйна аб'явіў пра павышэнне з 3 сакавіка цэн на нафтапрадукты, якія рэалізоўваюцца праз АЗС і складаюць (за 1 літр): бензін Нармаль-80 — 2 400 рублёў (было 2 250), бензін АІ-92 — 3 000 (2 870), бензін АІ-95, АІ-95-Еўра — 3 400 (3 240), дызельнае паліва — 2 850 (2 580).

**Камп'ютары, электроніка і аргтэхніка**

Цэны на гэтыя тавары выраслі на 15—30 працэнтаў. Прадаўцы тлумачаць такое павышэнне непрадказальнай сітуацыяй на валютным рынку краіны — невядома, па якіх коштах ім самім прыйдзецца закупляць дадзеную групу тавараў заўтра. Сёння гэты рынак занадта ліхаманіць. Праўда, як мы ўжо пісалі, і раней курс долара пры набыцці электронікі, аргтэхнікі і камп'ютараў быў вышэйшы за афіцыйны працэнтаў на 15—20.

**Ці павысяцца цэны на іншыя тавары і паслугі ў нашай краіне?** З гэтым дый іншымі пытаннямі мы звярнуліся да былога старшыні камітэта цэн Міністэрства эканомікі РБ **Аляксандра Грэцкага:**

— Тое, што цэны «палезуць» угору, было зразумела яшчэ напрыканцы мінулага года, калі «накачваўся» сярэдні заробак у 500 долараў. Нічога ж у гэтым жыцці са століне бярэцца. Апошнія гады ў нас нярэдка прывалюе наступная практыка: павысіць зарплату на рубель, а адняць 3 рублі за кошт павышэння цэн на тавары і паслугі. Таму, канешне, было адразу зразумела, што з новымі заробкамі і старымі цэнамі мы (а дакладней, наша эканоміка) не ў стане доўга спраўляцца.

**— Радавых спажыўцоў больш цікавяць прагматычныя пытанні датычна цэн — «папаўзуць» яны ўгору ў іншых галінах ці ўсё ж такі іх можна неяк стрымаць?**

— Канешне, папаўзуць, а як інакш? Разумееце, у цэн ва ўсім свеце ёсць два «жалезныя» правілы. Першае: цэны ў адной эканамічнай прасторы імкнуцца не ўніз, а ўверх. Другое: павышаныя цэны амаль ніколі ўжо не зніжаюцца. Але не гэта самае страшнае ў нашай сітуацыі. Непрыемны сюрпрыз заключаецца ў тым, што з 1 ліпеня гэтага года мы павінны далучыцца да Адзінай эканамічнай прасторы, дамінуючую ролю ў якой адыгрывае Расія. Ну а цяпер успомніце расійскія цэны на тавары і паслугі і суаднясіце іх з нашымі. Калі нас прымусілі пагадзіцца з расійскімі цэнамі на легкавыя аўто пасля ўступлення ў АЭП, то датычна іншых груп тавараў, мяркую, сітуацыя складзецца гэтак жа.

І па логіцы, навошта патрэбна адзіная эканамічная прастора, калі ў ёй прысутнічаюць розныя цэны? Пытанне толькі ў тым, наколькі нам выгадная і перспектыўная гэтая прастора.

**ДА ЧАГО ІДЗЁМ**

У студзені 2011 года сярэднія рознічныя цэны ў Смаленскай вобласці былі вышэйшыя за аналагічныя цэны ў Беларусі: на ялавічыну — на 45,1%, свініну — на 68,2%, вараныя каўбасныя вырабы — на 20,6–40,7%, малако — на 79,1%, смятану — на 70,4%, тлусты тварог — на 99,7%, сметанковае масла — на 30,8%, цвёрды сыр — на 30,8%, цукар-пясок — на 49,1%, бульбу — на 91,8%.

У Бранскай вобласці цэны вышэйшыя, чым у Беларусі: на ялавічыну — на 43,9%, свініну — на 50,2%, вараныя каўбасныя вырабы — на 69%, малако — на 43,6%, смятану — на 31,1%, тлусты тварог — на 41,8%, сметанковае масла— на 11,4%, цвёрды сыр — на 33,7%, цукар-пясок — на 31,6%, бульбу — на 65,7%.

(Паводле даных Міністэрства эканомікі РБ на канец лютага 2011 года.)

**Віктар ІВАШ.**

## СВЕТ ПРА БЕЛАРУСЬ

# «СУЩЕСТВУЕТ ВИДЕОЗАПИСЬ УБИЙСТВА ГОНЧАРА И КРАСОВСКОГО»

ОТ ИСТОЧНИКА В РОССИИ ВДОВЕ ИСЧЕЗНУВШЕГО БЕЛОРУССКОГО БИЗНЕСМЕНА СТАЛО ИЗВЕСТНО, ЧТО ПРОИЗОШЛО НА САМОМ ДЕЛЕ. В ПОСЛЕДНИЙ РАЗ ИРИНА КРАСОВСКАЯ ВИДЕЛА СВОЕГО МУЖА АНАТОЛИЯ КРАСОВСКОГО ЖИВЫМ 16 СЕНТЯБРЯ 1999 ГОДА.

В тот вечер выдающийся бизнесмен вел Jeep Cherokee по Фабричной улице в Минске. В машине находился его близкий друг, один из лидеров оппозиции, председатель Центризбиркома Беларуси и кандидат в президенты Виктор Гончар. Неожиданно один автомобиль заблокировал им дорогу, а второй затормозил перед ними, вынуждая джип остановиться. Из машин выскочили вооруженные бандиты, разбили стекло в автомобиле, вытащили оттуда Красовского и Гончара. Больше никого из них не видели.

У Красовской нет иллюзий по поводу этого вечера. Она убеждена, что убить обоих мужчин отдал приказ лично Александр Лукашенко, президент Беларуси с 1994 года, называемый последним диктатором Европы. «Когда муж пропал, я не знала что делать. Я даже не понимала, что происходит, – рассказала женщина The Washington Diplomat. – Я стучала во все двери. Наконец я поняла, что только международное сообщество может мне помочь, потому что в Беларуси нет справедливости».

Красовская говорит, что «если бы Гончар не пропал, я уверена, что он был бы следующим президентом Беларуси». Она объясняет, что ее муж помогал спонсировать политическую кампанию Гончара в то время. По словам Красовской, «белорусский КГБ начал расследование случившегося. Они почти выяснили правду и арестовали человека, ответственного за похищение. Но потом президент дал приказ освободить этого человека и уволил генерала, возглавлявшего КГБ».

Убийство и его замятие – звучит как сцена из бестселлера 1981 года «Парк Горького» Мартина Круза Смита, но это не детективный роман. Это скорее жутко напоминание о том, что может случиться даже сегодня с тем, кто идет против Лукашенко. «Никто и представить не мог, что режим может быть таким жестким, – говорит Красовская. – Я ожидала, что они могут уничтожить его бизнес или посадить в тюрьму. Но я никогда не думала, что они могут убивать людей».

Красовская выросла при коммунизме, но, по ее словам, она радовалась, когда Советский Союз, наконец, развалился и Беларусь стала независимым государством. «Это был как глоток свежего воздуха. Мы думали, что станем жить лучше и сможем свободно путешествовать и побывать в остальной Европе, получить образование и демократию. Было столько надежд, – вспоминает она. – Когда к власти пришел Лукашенко, я подумала, что это какая-то шутка. Он выглядел, как смешной человек. Он не мог правильно говорить, и его речи были такими глупыми».

В то время Красовская преподавала детскую психологию в ведущем университете страны и была замужем 24 года. Ее мужу было 47, когда он исчез. «Есть видеозапись убийства, но власти никогда не позволят расследовать дело до конца, потому что они сами все это организовали. Даже официальный следователь сказал нам об этом. От источника в России нам стало известно, что произошло на самом деле. Так что мы знаем, кто организовал все и кто отдал приказ», - говорит Красовская.

В 2002 году Красовская и ее подруга Светлана Завадская, жена журналиста Дмитрия Завадского, похищенного двумя годами ранее, организовали твердо придерживающуюся правых взглядов инициативу «Мы помним», чья задача, как написано на сайте, заключается в распространении правдивой информации о политически мотивированных исчезновениях граждан Беларуси и информировании мирового сообщества о ситуации в Беларуси». В октябре 2004, после выхода резкого доклада Совета Европы о нарушениях прав человека в стране, Конгресс США одобрил, и президент Джордж Буш подписал «Акт о демократии в Беларуси». Закон разрешает помощь США политическим партиям, НПО и независимым СМИ, распространяющих идеи демократии и прав человека в Беларуси.

Красовская вернулась на родину в декабре, и ее чуть не арестовали вечером 19 декабря, когда 600 человек были задержаны на главной площади Минска во время протеста против результатов сомнительных выборов, которые продлили правление Лукашенко еще на пять лет. «Людей на краю площади избивали, но я с друзьями была в середине, и нас сжали со всех сторон. Там было больше людей, чем милиции. У них не было достаточно сил, чтобы арестовать всех, – вспоминает она. – Мне повезло, но большинство из моих друзей арестовали. Три оппозиционных кандидата до сих пор находятся в тюрьме».

Власти утверждают, что Лукашенко выиграл выборы с 79,6 процентами голосов, но Красовская сомневается, что он набрал хотя бы 40 процентов, уж точно не больше. «Выборы не были признаны ОБСЕ (Организацией по безопасности и сотрудничеству в Европе), а это означает, что Лукашенко нелегитимен, – говорит она. – Проблема в том, что гражданское общество не может участвовать в подсчете голосов. В помещение, где происходит подсчет голосов, к столу подсчета никому нельзя подойти, так что можно фальсифицировать результаты сколько угодно».

**Ларри Лакснер, «The Washington Diplomat».**

## НАША ЎЛАДА

# УСЛОВИЯ, КОТОРЫЕ ОПРЕДЕЛЕНЫ КАК ПЫТКИ

ЮРИСТ ПАВЕЛ САПЕЛКО, ДВЕ НЕДЕЛИ НАЗАД ИСКЛЮЧЕННЫЙ ИЗ КОЛЛЕГИИ АДВОКАТОВ, В ИНТЕРВЬЮ «САЛІДАРНАСЦІ» ПРОЛИЛ СВЕТ НА РЕАЛЬНОЕ ПОЛОЖЕНИЕ В СИЗО КГБ СВОЕГО БЫВШЕГО ПОДЗАЩИТНОГО, ЭКС-КАНДИДАТА В ПРЕЗИДЕНТЫ АНДРЕЯ САННИКОВА.

**– В интервью «Радыё Свабода» вы заявили, что инициатива о вашем исключении исходила от председателя КГБ и Минюста. Откуда у вас эта информация?**

– Я видел материалы, которые были представлены Министерством юстиции. Минюст вынес представление в президиум коллегии адвокатов на основании письма председателя КГБ.

**– Когда в последний раз вы видели Андрея Санникова? Как он себя чувствовал: как его здоровье, психологическое состояние?**

–– 16 февраля. Знаете, с того времени как в бытность мою адвокатом мне вынесли предписание, я отказался отвечать на эти вопросы. И отказался отвечать не потому, что это тайна следствия.

Но считаю, того, что я сказал в начальный период следствия, уже достаточно. Каково состояние здоровья Андрея Санникова – нужно спрашивать у тех, кто дальше будет защищать его интересы. Если еще точнее: нужно добиваться того, чтобы состояние его здоровья стало предметом исследования, которое будет открытым и подконтрольным обществу. Нужно добиваться того, чтобы Санников был реально обследован медиками, и результаты обследования были доведены, по крайней мере, до его родных и близких. А говорить о том, какие мои ощущения… Я много чего видел. Но пока Санников там, я стараюсь об этом не говорить.

**– Писал ли Санников какие-то покаянные письма?**

– Во всяком случае, я ничего об этом не знаю. Сомневаюсь. Но скажу так: чтобы не написал Санников, находясь в тех условиях, куда его поместили, – это не должно приниматься во внимание во-о-бще. Этот период жизни нужно просто вычеркнуть. Чтобы он не написал, чтобы не сделал, более того, какие бы показания не дал – на это не надо обращать внимания. Человек находится в тех условиях, которые международными нормами определены как «пытки» – бесчеловечное, унижающее обращение. Как минимум.

– Как мне написать в тексте: я надеялся, что Павел Сапелко расскажет то, что не мог рассказать, будучи адвокатом, но он решил по-прежнему не отвечать на некоторые вопросы, т.к. все еще опасался за будущее своих бывших подзащитных?

– Правильнее будет написать, что Сапелко не мог ответить на вопросы, не согласовав ответы со своими подзащитными. Я могу вам сказать так. Когда идет речь о применении недозволенных методов следствия, реакция адвоката обычно выглядит следующим образом. Подзащитный заявляет: в отношении меня применялись недозволенные методы следствия. Адвокат задает вопрос, что намерен делать подзащитный: подавать жалобу или воздержаться – потому что зачастую последствия могут быть прямо противоположными ожидаемому.

Когда адвокат общается со своим подзащитным наедине в течение 20 минут в первый день, когда еще непонятно о чем пойдет речь дальше, и впоследствии лишен возможности постоянно общаться с ним – это не работа. Конечно, мне хотелось встретиться с Санниковым, хотя бы рассказать какие действия предпринимаются в его защиту. Но я и этого не мог толком рассказать. Было так. Я прихожу – в кабинете сидит следователь, сидит Санников или его приводят позже. Начинается допрос. Нам во время следственного действия общаться с Санниковым нельзя – так считает следователь. Обсуждать какие-то вопросы по делу – тоже нельзя. Единственное, до чего снисходил следователь, разрешал при нем вкратце обсудить какие вещи и продукты передать Санникову при следующей передаче в СИЗО КГБ.

**– Что сейчас главное для Санникова – выйти здоровым?** Мне кажется, просто выйти. На любых условиях. И выйти чем скорее, тем лучше.

**Руслан Горбачев.**

**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандр Шчамлёў

**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы.
Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742

**Наклад:** 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна